русь в России состоялась пресс-конференция с участием представителей компании Wargaming, посвященная празднику «Wargaming Fest: День танкиста», который пройдет 15 сентября в Минске. Организаторы пригласили на фестиваль 45 млн. российских игроков World of Tanks и их семьи. По сравнению с прошлым годом фестиваль существенно расширил географию участников: в 2018 году на «День танкиста» приехали представители 10 стран, в то время как на сегодняшний день в зону повышенного комфорта «Премиум-ангар» уже ожидают гостей из 28 государств: как традиционных – Германия, Чехия, Франция и Польша, так и экзотических – ОАЭ, Гонконг, Бахрейн и Кувейт [2].

Результатом всех событийных мероприятий является увеличение различных показателей деятельности туристической сферы. Увеличивается число дней пребывания в гостинице, количество гостиниц и других средств размещения, наблюдается рост выручки предприятий общественного питания, как следствие рост занятости населения. Так в 2018 г. по отношению к 2017г. их численность посетителей концертов по Беларуси увеличилась на 100,2 тыс. чел. и составила 1127,8 тыс. чел. посещений. Число посещений концертов на 1000 чел. населения возрос в 2018г. с 108 до 119 чел.[4, с. 67].

**Заключение.** Таким образом, в результате исследования выяснилось, что наша страна обладает достаточной базой мероприятий не только для развития внутреннего туризма, но и въездного. Больше нескольких десятков фестивалей привлекает сотни тысяч человек, это способствует развитию социально-культурных, экономических и туристических отношений.

Благодаря активной деятельности организаторов различных фестивалей, в нашей стране будет и дальше развиваться событийный вид туризма, который будет способствовать развитию туристической деятельности страны и ее экономическому росту.


1. Belarus.by Официальный сайт Республики Беларусь [Электронный ресурс] Фестивали в Беларуси - Режим доступа: https://www.belarus.by/ru/about-belarus/culture/festivals-in-belarus Дата доступа: 09.09.2019
2. WARGAMING.NET Организаторы «Wargaming Fest: День танкиста» ожидают более 200 000 гостей из 28 стран [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://wargaming.com/ru/news/wg-fest-news/ Дата доступа: 09.09.2019.
3. БЛЕТА. "Славянский базар" [Электронный ресурс] – Режим доступа: https://www.belta.by/culture/view/slavjanskij-bazar-segodnja-torzhestvenno-otkryvaetsja-v-vitebske-354522-2019 Дата доступа: 09.09.2019.
4. Туризм и туристические ресурсы в Республике Беларусь: стат.сб. [Электронный ресурс]. – Минск: Нац. стат. комитет Респ. Беларусь, 2019. - Режим доступа : http://www/belstat/gov.by. - Дата доступа : 10.09.2019


## УКЛАД ДВАРАНСТВА ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ Ў РАЗВІЦЦЁ НАВУКІ АПОШНЯЙ ТРЭЦІ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.


***Мізярска Н.А.,***

*суіскальнік ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік – Лобач У.А., доктар гіст. навук, прафесар*


З другой паловы XIX ст. на Беларусі распачаліся грунтоўныя даследванні беларускіх зямель, што тлумачыцца не толькі развіццём навукі ў цэлым, але і падзеямі, якія выклікалі павышаны інтарэс да беларускага народа і яго гісторыі. Нягледзячы на складаную грамадска-палітычную сітуацыю на Беларусі пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. і жорсткую палітыку русіфкацыі краю, мясцовыя даследчыкі актыўна займаюцца вывучэннем Беларусі. Прадстаўнікі дваранства Віцебскай губерні ўнеслі значны ўклад у развіццё айчыннай навукі, сярод якіх былі М.Ф. Кусцінскі і А.С. Грабніцкі-Дактаровіч.

Актуальнасць абранай тэмы абумоўлена значным укладам прадстаўнікоў дваранства Віцебскай губерні ў развіццё айчыннай культуры апошняй трэці XIX – пачатку XX в. і недастатковым узроўнем даследвання праблемы ў айчыннай гістарыяграфіі.

Мэта – паказаць месца і ролю дваранства Віцебскай губерні ў культурных працэсах апошняй трэці XIX – пачатку XX ст.

**Матэрыял і метады.** Для дасягнення пастаўленай мэты былі выкарыстаны працы з айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. У артыкуле былі выкарыстаны, як агульнанавуковыя метады, так і спецыяльна-гістарычныя: гісторыка-генетычны і гісторыка-параўнальныя метады

**Вынікі і іх абмяркаванне.** М.Ф. Кусцінскі нарадзіўся 28.09.1829 г. у маёнтку Завідзічы Лепельскага павета Віцебскай губерні ў дваранскай сям’і, скончыў Віленскі дваранскі інстытут з

Репозиторий ВГУ

срэбным медалём і юрыдычны факультэт Пецяргбурскага ўніверсітэта[2, с. 490]. Кусцінскі атрымаў грунтоўную адукаыю, адвольна валодаў польскай, рускай і мясцовай беларускай гаворкай, ведаў французскую і нямецкую мову. Усе гэта абумовіла кола яго навуковых інтарэсаў, скіравала да заняткаў археалогіяй, краязнаўствам і этнаграфіяй [3, с. 85]. На археалагічнай выставе ў Маскве была прадстаўлена Віцебская губерня і старажытнасці з калекцыі М.Ф. Кусцінскага[4, с. 7]. Археалагічнымі раскопкамі Кусцінскі пачаў займацца з пачатку 1850-х г.: даследваў курганы ў вярхоўі Волгі, Дзвіны і Дняпра і таксама ў сваім маёнтку Завідзічы. На сродкі Маскоўскага археалагічнага таварыства ён выявіў 94 курганныя групы і 12 гарадзішчаў, з якіх паспеў даследваць толькі 18 курганаў і 2 гарадзішчы, склаў археалагічную карту Віцебскай губерні. Кусцінскі знайшоў курган, у якім быў каштоўны артэфакт – лампа-свяцільня, выраблена персідскім майстрам у IX ст. У сваіх даследваннях Кусцінскі не заўсёды рабіў грунтоўныя высновы, не звяртаўся да канкрэтнай дацiроўкі пахавання ў курганах. Яго больш цікавіла пытанне аб “натуральных межах” распаўсюджвання племені крывічоў[ 1, с. 116–117].

Адам Станіслававіч Грабніцкі-Дактаровіч нарадзіўся 6 студзеня 1857 у вёсцы Тётча Лепельскага павета Віцебскай губерні. Адам Грабніцкі вучыўся 3 гады ў прыватнай школе ў Туросах (Ушацкая валасць, Лепелький павет), дзе ён вывучаў нямецкую мову ў немкі Краўсэ. Далей Адама узяла яго цётка разам з стрыечнымі братамі ў Віцебск, дзе яны вучыліся ў прыватнага настаўніка Безобразова да 2 класа. Адам Грабніцкі паступіў у 14 гадоў у класічную гімназію ў Віцебску, далей бацькі яго перавялі ў Дзвінск ў рэальную школу, дзе ён навучаўся да 1880 г. і вывучаў хімію. Пасля рэальнай школы, Адам Грабніцкі працягвае вучобу ў Пецяргбургскім лясным інстытуце, які скончыў у 1884 г. з залатым медалём за навуковую працу «Крахмал как запасное вещество наших деревьев», і яго пакінулі асістэнтам на кафедры. У 1902 г. Грабніцкі стаў прафесарам і ўзначаліў кафедру пладаводства і агародніцтва ў Лясным інстытуце. Разам з рэдактарам часопіса «Пладаводства» А.Ф. РУДСКІХ выдаў на рускай мове «Руководство по плодоводству» Н. Гашэ, якой ва ўсе часы карыстаюцца садоўнікі. У 1892 г. была выдадзена кніга А. Грабніцкі «Руководство по уходу за плодовым садом». Пазней Адам Грабніцкі заклаў свой сад «Рай» на хутары «Станішкі» на Літве, у якім праводзіў даследаванні і эксперыменты. У сваім садзе ён вырошчваў розныя гатункі пладовых дрэў, збіраў і вывучаў гатункі народнай селекцыі, апісанню якіх ён надаваў вялікую ўвагу. Дзякуючы сваім даследаванням і вялікаму памалагічнаму матэрыялу, Адам Станіслававіч Грабніцкі склаў «Атлас плодов», што стала велізарнай падзеяй у гісторыі айчыннага пладаводства. А.С. Грабніцкі памёр 13 кастрычніка 1941 г. У савецкі час былі прыняты меры па захаванню архіва навукоўца і аднаўленню саду. У Станішках быў адкрыты мемарыяльны музей і помнік Адаму Грабніцкаму [5].

**Заключение.** Такім чынам, дваранства Віцебскай губерні зрабіла значны ўклад у развіццё беларускай навукі апоняй трэці XIX - пачатку XX ст. М.Ф. Кусцінскі з’яўляўся адным з першых беларускіх археолагаў, краязнаўцам, этнографам,фатографам, членам Віцебскага статыстычнага камітэта, Віцебскага сельскагаспадарчага таварыства, аўтарам гісторыка-этнаграфічнага і прыродазнаўчага нарыса аб Лепельскім павеце, археалагічных публікацый, аўтарам шматлікіх артыкулаў, стваральнікам прыватнага музея ў маёнтку Завідзічы Лепельскага павета. А.С. Грабніцкі-Дактаровіч –прафесар-памолаг, быў рэдактарам «Атласа пладоў», у якім апісаў пладовыя дрэвы, пашыраныя ў Расіі, у тым ліку на Беларусі і Літве. Асноўныя працы прысвечаны сортавылучэнню і апыленню пладовых культур. Удзельнічаў у стварэнні Поўнай энцыклапедыі рускай сельскай гаспадаркі.


1. Алексеев, Л.В. Ахеология и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е годы XX в. / Под ред. Б.А. Рыбакова. – Мн.: “Беларуская навука”, 1996. –206 с.
2. Археалогія Беларусі:энцыклапедыя. У 2Т. Т.1. А-К/ рэдкал: Т.У. Бялова (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. Энцык. Імя П. Броўкі, 2009. – 496с.:іл.
3. Лабачэўская, В.А. Новыя матэрыялы да біяграфіі М.Ф. Кусцінскага (1829-1905 гг.) па архіўных іапублікаваных крыніцах.VII Лепельскія чытанні: матэрыялы VII навукова-практычнай канферэнцыі (г. Лепель, 27-28 кастрычніка 2016 г.) / падрэд. Я.А. Грэбеня. – Віцебск: Віцебскаяабласнаядрукарня, 2017. – С.78-85
4. Brezgo, B. Ochrona zabytków przedhistorycznych w Witebszczyźnie i w Inflantach Polskich / B. Brezgo. – Warszawa, 1928. – 17 s.
5. Osobiste archiwum A. Rejmana w Warszawie. Zapisano przez St. Hrebnickiego ze słów Adama Hrabnickiego w Raju w sierpniu w 1936 roku.




Репозиторий ВГУ